**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна**
**за снежань 2020 г.**

## Мерапрыемствы ў рамках Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу

**2 снежня**

На гадзіне праблемнай размовы «Па-за зонай рызыкі» ў бібліятэцы ішла гутарка пра гісторыю ўзнікнення СНІДу, яго сімптомы, шляхі перадачы віруса, групы рызыкі, эпідэміялагічную сітуацыю ў Беларусі і раёне. Прысутныя падлеткі пазнаёміліся з выданнямі, якія асвятляюць гэту праблему, прагледзелі відэматэрыялы, адказалі на пытанні, прынялі ўдзел у абмеркаванні распаўсюджаных міфаў і легенд пра СНІД. Напрыканцы мерапрыемства яны атрымалі буклеты і памяткі з карыснай інфармацыяй.

Дзівінскі ф-л, 11 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**1 снежня**

У бібліятэцы адбылася прэзентацыя выставы-панарамы «Ад літаратурных радкоў – да сэрцаў чытачоў». Увазе чытачоў прапанаваны творы-юбіляры беларускіх аўтараў 2021 года.

ЦБ, 20 чал.

**4 снежня**

Аб’яўлены конкурс на лепшае анлайн-віншаванне «С Новым годом, Рождеством – настоящим волшебством». Конкурс праводзіцца ў дзвюх намінацыях: «Паэзія», «Проза».

ЦБ

**5 снежня**

Падчас конкурсна-гульнявой праграмы «Новы год каля брамы» дзеці адгадвалі загадкі, малявалі, рабілі навагоднія вырабы, расказвалі вершы, знаёміліся з новымі кнігамі. У завяршэнні мерапрыемства яны атрымалі падарункі.

Паляцічская ПБ, 8 чал.

**9 снежня**

Член літаратурнага клуба «ПаэтыКо» Надзея Момлік і бібліятэкар Дзівінскага філіяла Таццяна Гурыш прынялі ўдзел у праграме «Вас вітае Беларусь» на міжнародным радыё «Океан Плюс». Праграма прайшла ў фармаце творчай сустрэчы з беларускай паэтэсай, членам Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў Надзеяй Момлік. У праграме гучала шмат песень на вершы паэткі, у тым ліку ў выкананні Таццяны Гурыш.

Дзівінскі ф-л

**10 снежня**

На ўроку прававых ведаў «Я – дзіця, я – чалавек» вучні 5 – 7 класаў пазнаёміліся з Канвенцыяй аб правах дзіцяці, сумесна з бібліятэкарам прааналізавалі прыклады ўзаемаадносін і паводзін у надзвычайных сітуацыях, якія патрабуюць прававой адзнакі, гулялі ў гульні і разгадвалі рэбусы на дзіцячым прававым сайце.

Верхалеская ПБ, 10 чал.

**11 снежня**

Літаратурная гадзіна «Путалкі Бабы Ягі» сабрала вучняў 1 – 4 класаў. Удзельнікі мерапрыемства адказвалі на пытанні віктарыны па казках, гулялі ў гульні «Хто першы», «Непаседы», «Казачныкарагод».

Магдалінская ПБ, 12 чал.

**11 снежня**

Выязная гадзіна літаратурнага партрэта «Васіль Быкаў: доўгая дарога дадому» прайшла ў Лукскай сярэдняй школе. Мерапрыемства адбылося ў рамках сумеснага праекта з кінатэатрам «Радуга» «Кніга ў кадры». Супрацоўнікі бібліятэкі распавялі пра жыццёвы і творчы шлях знакамітага пісьменніка, пра яго значны ўнёсак у беларускую і сусветную літаратуру. Сустрэча суправаджалася прэзентацыяй і праглядам дакументальнага фільма «Фронтовые страницы».

ЦБ, 20 чал.

**12 снежня**

На ўроку маральнасці «Вірус брыдкаслоўя» ў бібліятэцы з вучнямі 5 – 9 класаў гаворка пра культуру зносін і засмечванне мовы ненарматыўнай лексікай суправаджалася прэзентацыяй «Як слова наша адгукнецца» і сацыяльным ролікам пра ўплыў прамовы чалавека на структуру вады.

Лукская ПБ, 9 чал.

**16 снежня**

У бібліятэцы адбылася творчая сустрэча з мясцовай паэткай членам літаратурнага клуба «ПаэтыКо» Нінай Пучык. Прысутныя пазнаёміліся з творчасцю зямлячкі, у тым ліку з вершамі, надрукаванымі ў лістападаўскім нумары часопіса «Алеся».

Стрыгаўская ПБ, 11 чал.

**20 снежня**

Дзень добрых сустрэч у бібліятэцы прайшоў пад дэвізам «Навучы сваё сэрца дабрыні». Прысутныя актыўна ўдзельнічалі ў розных конкурсах і віктарынах, знаёміліся з кнігамі аб міласэрнасці. У канцы мерапрыемства ўсе атрымалі памятныя падарункі.

Дзівінскі ф-л, 10 чал.

**27 снежня**

Паэтычныя анлайн-перапалкі «Я вам жадаю…» адбыліся паміж кобрынскімі паэтамі на пасяджэнні літаратурнага клуба “ПаэтыКо”. Члены клуба камунікавалі пры дапамозе інтэрнэт-платформы zoom. Яны чыталі свае вершы, віншавалі адзін аднаго з надыходзячымі Новым годам, Раством Хрыстовым, гулялі ў літаратурныя гульні «Жадаю вам» і «Бурымэ».

ЦБ, 6 чал.

**30 снежня**

Падчас майстар-класа «Феерверк навагодніх ідэй» вучні 1 – 5 класа рабілі ўпрыгожванні для бібліятэкі.

Балоцкая ПБ, 10 чал.

Ефціфеева Н. П.
8-01642-3-85-81